Источник: "Культура" - 2014-01-11



# Ружанскі метэарыт з 1894-га

**Дырэктар Музея «Ружанскі палацавы комплекс Сапегаў» Руслан Кніга паведаміў «К», што 18 снежня ў музейнай экспазіцыі з'явіўся... метэарыт. Што гэта менавіта ружанскі метэарыт, вядомы з 1894 года, даказана, па словах кіраўніка ўстановы, на 99 працэнтаў.**

Яўген РАГІН

Прынамсі, да такога меркавання прыйшлі пасля візуальнага агляду аб'екта вагой амаль у 30 кілаграмаў спецыялісты з Расіі і Украіны. Далейшая экспертыза будзе праведзена, магчыма, у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.



Каменна-жалезны метэарыт быў перададзены музею ў жніўні ад айца Аляксандра, настаяцеля мясцовага храма. Аб'ект знайшлі пад час рамонту царквы Святых Пятра і Паўла — адной з найстарэйшых на Пружаншчыне. Існуюць усе падставы меркаваць, што камень быў часткай царкоўнай агароджы, узведзенай пасля Другой сусветнай вайны.

Адносна таго, што метэарыт завяршыў свой палёт у Ружанах, але месца яго падзення аказалася нявысветленым, навуковы свет не меў сумненняў. Захавалася дастатковая колькасць сведчанняў таго палёту, зафіксаваных у 1894-м...

Новы экспанат выклікаў чарговую хвалю зацікаўленасці музейным комплексам з боку не толькі СМІ, але і турыстаў, колькасць якіх у Ружанах штогод павялічваецца.

К

Яўген Рагін. Ружанскі метэарыт з 1894-га